МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”
Факультэт беларускай і рускай філалогіі
Кафедра беларускага мовазнаўства

**Лазоўская**
**Дар’я Валер’еўна**

# МЕТАФАРА ЯК СРОДАК АДЛЮСТРАВАННЯ СВЕТАПОГЛЯДУ БЕЛАРУСАЎ: СЭНСАВА-ТЭМАТЫЧНЫЯ ТЫПЫ І МАРФАЛАГІЧНАЕ ВЫРАЖЭННЕ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ТВОРАЎ І. МЕЛЕЖА)

**Дыпломнае даследаванне**

**Навуковы кіраўнік –**
**кандыдат філалагічных навук,**
**дацэнт Ржавуцкая М. С.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Мінск, 2013**

# РЭЗЮМЭ

## ЛАЗОЎСКАЯ Дар'я Валер'еўна

## МЕТАФАРА ЯК СРОДАК АДЛЮСТРАВАННЯ СВЕТАПОГЛЯДУ БЕЛАРУСАЎ: СЭНСАВА-ТЭМАТЫЧНЫЯ ТЫПЫ І МАРФАЛАГІЧНАЕ ВЫРАЖЭННЕ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ТВОРАЎ І. МЕЛЕЖА)

**Ключавыя словы:** вобразнасць, метафара, вобразныя сродкі, мастацкі тэкст, семантычныя магчымасці метафары, сэнсава-тэматычныя тыпы метафары, марфалагічнае выражэнне метафар.

**Аб'ект даследавання** – мова твораў Івана Мележа.

**Прадмет даследавання** – метафара як сродак адлюстравання светапогляду беларусаў.

**Мэта работы** – даследаванне метафары як вобразнага сродку ў мове твораў Івана Мележа.

Для вырашэння пастаўленых задач быў выкарыстаны апісальны метад, а таксама элементы функцыянальна-стылістычнага, кантэкстуальнага, лінгвістычнага і статыстычнага аналізу.

**Навуковая навізна** выбранай тэмы заключаецца ў тым, што значэнне метафары ў мастацкай творчасці вельмі вялікае. Яна дапамагае стварэнню вобразаў, карцін, служыць для перадачы думак. Выкарыстоўваючы розныя тыпы метафар, аўтар дае чытачу магчымасць пранікнуць у самыя патаемныя думкі герояў, раскрыць іх унутраную сутнасць, складанасць характараў, дапамагае звярнуць увагу на непаўторныя ўласцівасці прадметаў і з'яў рэчаіснасці.

**Практычная значнасць** даследавання заключаецца ў магчымасці выкарыстання матэрыялаў дыпломнай працы пры даследаванні функцыянавання слова ў тэксце, у лексікаграфічнай практыцы; пры выкладанні сучаснай беларускай мовы, стылістыкі беларускай мовы і чытанні спецкурсаў у ВНУ, пры стварэнні вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў, пры напісанні курсавых і дыпломных прац.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ